ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
4
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 8 (1346)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПА ВЫНІКАХ ДЗЕЙНАСЦІ

штабоў «Камсамольскага пражэктара» горада Мінска бюро ГК ЛКСМБ прызнала пераможцам у групе вышэйшых навучальных устаноў штаб «КП» БДУ імя У. І. Леніна.

Н. ПАЎСЦЮК.

### З ЛЕКЦЫЯЙ

пра міжнароднае становішча перад вялікай аўдыторыяй студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта выступіў член Саюза журналістаў СССР, лектар Усесаюзнага таварыства «Веды» А. І. Дзёмін.

С. ІВАНОВА.

### ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ

Белдзяржуніверсітэта распрацавала чатыры маршруты прафарыентацыі, па якіх выедуць групы выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ, каб пазнаёміць старшакласнікаў, маладых рабочых, калгаснікаў і ваеннаслужачых у розных гарадах Беларусі са старэйшай навучальнай установай рэспублікі. Першая такая група ў саставе 25 чалавек паехала ў Віцебскую вобласць.

Т. САХАШЧЫК.

### НА ЎСЕСАЮЗНЫМ

мемарыяле імя генерала Д. Карбышава па вольнай барацьбе, які адбыўся ў канцы лютага ў Гродна, студэнт IV курса фізічнага факультэта Л. Баразна заняў першае месца, выканаўшы нарматыў майстра спорту СССР.

Н. КРОЙТАР,
старшыня
спортклуба універсітэта.

### ЗАМЕЖНЫЯ СТУДЭНТЫ

факультэта журналістыкі сустрэліся з Героем Савецкага Саюза Р. Н. Мачульскім, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў сакратаром Мінскага падпольнага абкома партыі, кіраваў злучэннем народных мсціўцаў Мінскай і Палескай абласцей.

Б. ЯЎСЕЙЧЫК.

### АЛЬМАНАХ

«Творчасць журналіста» ў трынаццаты раз падрыхтаваны на факультэце журналістыкі. У яго ўвайшлі лепшыя навуковыя працы, вершы, апавяданні, публіцыстычныя выступленні і крытычныя артыкулы студэнтаў журфака. Над выпускам працавалі студэнты-пяцікурснікі пад кіраўніцтвам прафесара Е. Л. Бондаравай.

У. АБРАМОВІЧ.



## ГАНАРОВЫ ЗНАК— ВЕТЭРАНУ ПАРТЫІ

ВЕТЭРАНУ ленінскай партыі, Герою Савецкага Саюза Аляксандру Васільевічу Кірсанаву, гады пасляваеннай мірнай працы якога прайшлі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, уручаны памятны знак «50 гадоў знаходжання ў КПСС».

Слаўная біяграфія Аляксандра Васільевіча неадрыўна ад гераічнай гісторыі Савецкай краіны. З 1920 года ён у радах Чырвонай Арміі.

Удзельнік грамадзянскай вайны, ён амаль з першых дзён Вялікай Айчыннай са зброяй у руках абараняў Радзіму на Паўднёвым, Сталінградскім, Цэнтральным і Беларускім франтах. У час фарсіравання Дняпра на Брагінскім кірунку ў ноч на 28 верасня 1943 года стралковая дывізія пад камандаваннем А. В. Кірсанава захапіла плацдарм і паспяхова адбівала варожыя атакі...

Ганаровы грамадзянін г. п. Брагін, г. Калінкавічы Гомельскай вобласці, генерал-маёр у адстаўцы А. В. Кірсанаў да 1960 года служыў у радах Савецкай Арміі. А потым многія гады працаваў прарэктарам Белдзяржуніверсітэта.

**НА ЗДЫМКУ:** прадстаўнікі партыйнага бюро універсітэта, рэктарата, партарганізацыі фізічнага факультэта, дзе на партыйным уліку стаіць Аляксандр Васільевіч, віншуюць ветэрана з уручэннем ганаровага знака.

Фота В. Шачака.

● НА МАРШЫ СБА

## ВЕЧАР ПРАЦОЎНАЙ СЛАВЫ

ГУЧАЦЬ са сцэны будатрадаўскія песні. Углядаюся ў твары сяброў са СБА «Таварыш» — напэўна кожны ўспамінае свой працоўны семестр, які быў для нас першым. Не, мы не ехалі за тысячу кіламетраў. Месца нашай дыслакацыі было недалёка ад Мінска. Спачатку нашы скептыкі з асцярогай аднесліся да выбару такога месца. Лічылі, што толькі дзе-небудзь у Карэліі ці Якуціі па-сапраўднаму можна зведаць будатрадаўскую рамантыку. Але ў хуткім часе гэтыя думкі адпалі.

Галоўнае, як гаварыў наш камандзір Саша Папко, што мы ўсе разам. І ад таго, як будзем працаваць і адпачываць, залежыць наша будатрадаўскае жыццё.

Сапраўды яно было цікавым, незабыўным... На вечары працоўнай славы сабраліся байцы трох мінулагодніх СБА факультэта журналістыкі. Ёсць што ўспомніць будатрадаўцам, ёсць што расказаць тым, у каго яшчэ працоўнае лета наперадзе.

Пра будатрад імя Амельянюка, які працаваў у Карэліі, красамоўна расказалі слайды, якія дэманстравалі і дапаўнялі каментарыямі яго байцы.

Канцэртную праграму паказалі на вечары байцы жаночага студэнцкага атрада імя Веры Харужай, што працавалі ў Стаўрапольскім краі.

Факультэцкае свята будатрадаў было не толькі дэманстрацыяй мінулагодніх дасягненняў. Яно стала прыступкай да новага працоўнага семестра, падрыхтоўка да якога ідзе ўжо поўным ходам.

І. ПАПКО,
баец СБА «Таварыш».

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

Загадчык кафедры ураўненняў матэматычнай фізікі факультэта прыкладной матэматыкі **МІКАЛАЙ ІОСІФАВІЧ ЮРЧУК** 17 лютага ў Інстытуце матэматыкі АН СССР абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук па тэме «Метад энергетычных няроўнасцей у даследаванні дыферэнцыйна-аператарных ураўненняў».

У Інстытуце літаратуры АН СССР 18 лютага доктарскую дысертацыю на тэму «А. В. Луначарскі і фарміраванне марксісцкай літаратурнай крытыкі» абараніў загадчык кафедры рускай савецкай літаратуры **ІГАР ПАЎЛАВІЧ КАХНО.**

Другую доктарскую дысертацыю абараніў нядаўна ў Інстытуце педагогікі АН СССР загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства **АДАМ ЯЎГЕНАВІЧ СУПРУН.** Яго тэма — «Лінгвадыдактычныя праблемы навучання рускай мове ў беларускай школе».

* * *

Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі ў студзені, лютым 1982 года:

**ГЕНАДЗЬ АЛЯКСЕЕВІЧ ХАЦКЕВІЧ** — факультэт прыкладной матэматыкі навуковы кіраўнік прафесар **Г. А. Мядзвездзеў;**

**АЛЯКСАНДР МАРКАВІЧ ЛЮДЧЫК** — фізічны факультэт, навуковы кіраўнік дацэнт **І. П. Зяцькоў;**

**ЮРЫЙ ПЯТРОВІЧ МАРКАЎ** — факультэт радыёфізікі і электронікі, навуковы кіраўнік прафесар **А. Ф. Чарняўскі;**

**ГАННА ІВАНАЎНА БАСАВА** — філалагічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Л. М. Шакун;**

**МІКАЛАЙ РЫГОРАВІЧ ПРЫГОДЗІЧ** — філалагічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **Л. М. Шакун;**

**ЛІДЗІЯ ФЁДАРАЎНА КУЗНЯЦОВА** — кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **В. С. Сцёпін;**

**ВЕНІЯМІН ЯЎГЕНАВІЧ ЯЦУК** — кафедра гісторыі філасофіі і логікі, навуковы кіраўнік прафесар **А. С. Кляўчэня;**

**ЖАННА ІВАНАЎНА ДРОНСКАЯ** — кафедра французскай і іспанскай мовы, навуковы кіраўнік дацэнт **М. І. Берлін;**

**МІКАЛАЙ ФЁДАРАВІЧ ГОЛУБЕЎ** — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі прафесар **В. Д. Ткачоў,** дацэнт **А. В. Латышаў.**

**Жадаем новых творчых поспехаў!**

● СЕКЦЫЯ ЛЕКТАРАЎ-МІЖНАРОДНІКАЎ

## ПАВЫШАЮЦЬ МАЙСТЭРСТВА

ПРАЙШЛІ першыя заняткі секцыі лектараў-міжнароднікаў, якая створана на базе гістарычнага факультэта і кафедр грамадскіх навук. У ходзе работы секцыі лектары будуць павышаць сваё прафесійнае майстэрства і метадычны ўзровень. Прадугледжаны мерапрыемствы па прыцягненню ў рады лектараў-міжнароднікаў аспірантаў і студэнтаў, якія закончылі школу маладога лектара, для падрыхтоўкі іх да актыўнай лектарскай работы.

«Ва ўмовах абвастрэння міжнароднай абстаноўкі,— гаворыцца ў пастанове ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», — выкліканага палітыкай імперыялізму, перш за ўсё амерыканскага, першаступеннае значэнне для лёсу чалавецтва мае актыўнае ажыццяўленне ленінскай стратэгіі міру, якую адстойвае наша партыя і дзяржава». Лектары-міжнароднікі заклікаены яшчэ актыўней тлумачыць студэнтам і працоўным Мінска і рэспублікі Праграму міру.

На першых пасяджэннях секцыі з цікавымі паведамленнямі аб некаторых праблемах сучаснага міжнароднага становішча выступілі лектары-міжнароднікі: дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў В. В. Бянькоўскі і выкладчык кафедры палітэканоміі У. М. Мархонька. Актыўны ўдзел у рабоце секцыі прымаюць дацэнты і выкладчыкі Ф. І. Мельнік, І. Ф. Раманоўскі, К. А. Даўгучыц, М. У. Жаўно і іншыя.

У плане работы — абмеркаванне найбольш складаных праблем міжнароднага становішча, правядзенне сустрэч у студэнцкіх аўдыторыях, вечары пытанняў і адказаў, выезды на прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы, рабочыя інтэрнаты.

К. ОСІПАЎ,
кіраўнік секцыі, дацэнт
кафедры гісторыі СССР
эпохі сацыялізму.

# ПРЫСТУПКА ДА МАРЫ

РАНІЦА. Студэнты спяшаюцца на заняткі. У шумных калідорах хімічнага факультэта ўсталёўваецца цішыня. Я застаюся адна на другім паверсе. Уважліва ўглядаюся ў фотаздымкі выдатнікаў хімфака. «Імі ганарыцца наш факультэт» —чытаю ўверсе. Якія розныя позіркі, выразы твараў, характары і шляхі да навукі.

Асаблівa доўга затрымліваюся каля аднаго фотаздымка. На ім студэнтка чацвёртага курса, ленінская стыпендыятка Галіна Грэчка.

Яшчэ ў дзяцінстве марыла яна стаць настаўніцай. А ў сёмым класе ўпершыню сустрэлася з прадметам, які стане яе любімым — хіміяй.

— У вялізных ураўненнях і складаных хімічных формулах, якія для многіх здаваліся незразумелымі, я знаходзіла асаблівую прыгажосць. Усё гэта было для мяне так незвычайна, што я ўспрымала хімію як музыку, як паэзію,— расказвае Галіна.

З залатым медалём закончыла яна сярэднюю школу і вырашыла займацца любімай справай. Але так здарылася, што на хімічны факультэт БДУ прыйшлося паступаць двойчы. І вось мара здзейснілася.

— Калі я ўпершыню прыйшла на хімфак,—успамінае Галя,— усё мне тут здалося цікавым, вартым увагі.

Аб тым, што Галіне назначана Ленінская стыпендыя, сама яна даведалася амаль што ў апошнюю чаргу. Глядзела на спіс, чытала і перачытвала сваё прозвішча... І вучыцца на выдатна стала яе ўнутранай неабходнасцю.

Потым Галя ўдзельнічала ў Рэспубліканскай алімпіядзе па фізічнай хіміі і заняла першае месца. Было нялёгка, але думка аб тым, што яна прадстаўляе родны факультэт, надавала сілы.

Не адзін раз выкладчыкі прапаноўвалі: «З тваімі здольнасцямі трэба абавязкова ісці пасля заканчэння універсітэта ў аспірантуру». Але для Галіны далейшы шлях у жыцці ўжо вызначаны — яна будзе выкладчыцай хіміі, будзе вучыць дзяцей таму, што сама палюбіла ўсёй душой.

У час летняй практыкі Галіна працавала важатай у піянерскім лагеры «Рамонак» пад Бабруйскам. І зараз мільгаюць у яе вачах вясёлыя агеньчыкі, калі расказвае пра той час, пра штодзённыя і незабыўныя піянерскія справы.

**І. САЎЧУК.**

# «ЯНА РАЗУМЕЕ...»

АДНОЙЧЫ мне трэба было трапіць у інтэрнат № 2. Дакумента з сабой не было. «Ну,— думаю,—як-небудзь правруся».

...Сядзіць на варце жанчына. І вочы добрыя-добрыя. «Пусціць, і пра студэнцкі білет не спытае!» Як ішоў — так і падаўся міма...

— Малады чалавек, пачакайце! — голас рашучы.

Дзе там «пачакайце». Толькі праз тры паверхі прыпыніўся аддыхацца.

Расказаў хлопцам.

— Эх, і навошта ты Ірыну Іванаўну пакрыўдзіў,— абурыліся сябры.— Растлумачыў бы ўсё, яна б зразумела.

Сорамна стала. Іду назад. Вахцёр глядзіць з дакорам:

— Што, задаволены? Ад старой уцёк? Каб мне з паўвека адкінуць, тады б паглядзелі, хто каго!

— Колькі ж вам гадоў? — спытаў.

— Ды трошкі ёсць,— засмяялася жанчына.

Высветлілася, што Ірына Іванаўна Іванова крыху старэйшая за Вялікую Кастрычніцкую.

— Рэвалюцыю добра памятаю, хаця мне тады пяць гадоў было,— твар Ірыны Іванаўны стаў крыху сумным. — Мабыць таму, што цяжка нам было ў той час. Чацвёра дзяцей і маці адна. Пра вучобу нават не думалі. Хаця б пражыць як... А потым ленінскі дэкрэт выйшаў... У школу пайшла.

Давялося жанчыне паспытаць гора за сваё жыццё... У гады вайны была ў эвакуацыі, у Бухары. Муж на фронце. Дачку сама гадавала...

Прыйшла доўгачаканая перамога. А разам з ёю і дзве трагічныя звесткі: адзін брат загінуў пад Віцебскам, другі прапаў без вестак...

Але Ірына Іванаўна на лёс не крыўдзіцца...

— Жыву, як усе. У інтэрнаце сем гадоў працую. Разам з вамі, студэнтамі, і сама маладзейшай раблюся. Вось і бегаць навучыцце...— смяецца.

— Прабачце, калі ласка,— мне зноў зрабілася няёмка.— Больш не буду.

— Ды што там. Дзеці вы яшчэ.

«І сапраўды, — падумаў я, — для гэтай жанчыны мы ўсе яшчэ дзеці. Хаця сярод нас і вусатыя, і лысаватыя ёсць. Усіх яна ведае ў твар. Для кожнага знойдзе добрае слова...».

Мы пасябравалі з Ірынай Іванаўнай.

**У. ДАШУК.**

# СА СВЯТАМ 8 САКАВІКА!

**...Сакавік —**
**гэта**
**месяц-выбраннік,**
**Прыродай падказаны**
**ўсім.**
**Не шкадуйце**
**пралесак ранніх**
**Маці,**
**жонкам,**
**любімым сваім!..**



# Не забыць незабыўнае

ВОЛЬГА СІЛАНЦЬЕЎНА КЛІМОВІЧ — загадчыца склада. З яе рук усе падраздзяленні атрымліваюць канцылярскія і бытавыя тавары, інвентар, неабходныя ў вялікай і складанай гаспадарцы БДУ.

— І шыла, і мыла — усё ў мяне,—жартуе Вольга Сіланцьеўна.

Амаль усё пасляваеннае жыццё гэтай жанчыны так ці інакш звязана з універсітэтам. У пяцідзесятыя гады яна працавала вахцёрам у юрыдычным інстытуце, потым — камендантам аднаго з інтэрнатаў. А калі спатрэбіўся загадчык склада — прыйшла сюды. За сваю шматгадовую добрасумленную працу В. С. Клімовіч да 60-годдзя БДУ ўзнагароджана граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Але сённяшняя гаворка з ёю — зусім пра іншае. Незнарок закранула я нейкі балявы нерв... Вольга Сіланцьеўна ўспамінае вайну.

**— Ведаеш,—гаворыць яна,— цяжкі камень у мяне на душы. Можа, калі выкажуся, лягчэй стане... Ты, напэўна, чытала кніжку «Я з вогненнай вёскі»... Там і пра нас напісана, пра вёску Люцін Магілёўскай вобласці. На маіх вачах хаты гарэлі, людзі. Як цяпер, усё памятаю: страшэнныя тыя падрабязнасці ўсё жыццё ў вачах стаяць... Прабач, што плачу. Не магу расказваць па-іншаму.**

...Мне нельга перабіваць, не трэба баяцца пауз, я павінна толькі слухаць. Кожнаму чалавеку, хоць раз у жыцці, патрэбна, каб яго выслухалі...

**— Дом наш самы крайні ад лесу стаяў — адно добра было. Як толькі немцы паказваліся, мы туды ўцякалі. Пачулі аднойчы стрэлы, выбеглі з дому, бачым: цугам немцы ідуць, усю вёску акружылі. Што рабіць! Уцякаць ужо позна. Сядзім з сёстрамі ля акенца, быццам замерлі. Маці толькі, запалоханая, па хаце мітусіцца...**

**А потым усіх жыхароў сагналі на выган, падзялілі: жанчыны — у адзін бок, мужчыны — у другі. Стаім, галосім, развітваемся адзін з адным. Маленькіх дзяцей было загадана кінуць на зямлю...**

Вельмі цяжка ўспамінаць пра гэта Вользе Сіланцьеўне. І боль тая ўжо, здаецца, загаілася. Толькі ўсё да гэтага часу жудасныя сцэны вайны мрояцца ёй, не даюць спакойна спаць.

**— Вось датляваюць апошнія бярвенні іх хаты. Маці корпаецца ў зямлі, на папялішчы, быццам знайсці штосьці хоча. Глянеш туды, дзе стаяла суседская хата, а позірк бяжыць далей, далей, няма на чым спыніцца... Нечая згорбленая постаць рухаецца насустрач, набліжаецца. Можна разабраць ужо і словы жудаснага енку. Гэта суседка галасіла. Яе мужыка разам з іншымі мужчынамі загналі ў старую школу, зачынілі дзверы, падпалілі. Доўга потым на гэтым месцы розныя металічныя рэчы знаходзілі — то гузік, то сцізорык. Дарэчы, фотаздымак нашай суседкі разам з дзецьмі ў кніжцы гэтай змешчаны. Мабыць, памятаеш!**

...Мы сядзім у маленькім пакойчыку ў Вольгі Сіланцьеўны на рабоце. «Добра, што сёння так мала наведвальнікаў», — толькі паспела я падумаць, як пачула добразычлівае:

— Добры дзень, Вольга Сіланцьеўна!

— А, хлопцы... Гэта з геафака,—паведаміла яна мне.—Ну, давайце свой ліст.

Вольга Сіланцьеўна папраўляе акуляры, прачытвае накладную:

— Так, кардон — трэба ўзважваць. Лента ліпкая — тры, вёдры ацынкаваныя — чатыры...

— Вольга Сіланцьеўна, наша з вамі свята набліжаецца...

— Жанчыны майго пакалення павінны быць вытрыманымі, — адгукнулася яна. — Разумееш, забыць усё тое мы не можам, не ўмеем. Але трэба памятаць і іншае: дзеля чаго засталіся жывымі... Каб вырошчваць дзяцей, гадаваць унукаў, займацца сваёй справай на зямлі.

**А. ЛЫСЮК.**

**Для першакурсніц вытворчага патока механіка-матэматычнага факультэта першая студэнцкая сесія прайшла паспяхова. Пачаўся другі семестр. Цяпер у іх самая звычайная лекцыя. Выкладчык знаёміць студэнтаў з курсам «Алгебра і аналітычная геаметрыя». Паяўляюцца на дошцы і знікаюць лічбы, формулы, графікі. Уважліва слухаюць студэнткі, хутка запаўняюцца старонкі канспектаў. Першакурсніцы разумеюць, што сёння ўжо ідзе падрыхтоўка да чарговых экзаменаў.**

**Фота В. ШАЧАКА.**



# ДАБРАТА

ЖАНЧЫНА размаўляла па тэлефону. Прыемны, гучны голас, які можа быць толькі ў добрых людзей.

Калі пазнаёміліся, Антаніна Фёдараўна крыху збянтэжылася. Не чакала. Потым ажывілася, стрымана ўсміхнулася. І зноў жа, усмешка цёплая, шчырая.

— Не ведаю, што і казаць. Біяграфія самая звычайная.

Больш як 32 гады працуе ва універсітэце Антаніна Фёдараўна Алейнікава. Толькі гэта, мабыць, не галоўнае, за што яна ў другі раз узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

...Здаецца, галоўная рыса яе характару — дабрата. Адсюль жа і імкненне не падвесці таварышаў па працы, адданасць справе, добрасумленнасць, вялікая патрабавальнасць да сябе.

Прыгадваецца адзін выпадак. У час вайны сям'я жыла ў сяле Вязаўка Курылаўскага раёна. Бацька памёр, праз некаторы час загінуў на фронце старэйшы брат. Тых грошай, што зарабляла маці, не хапала. Акрамя Тоні, раслі яшчэ малодшыя брат і сястра. І 16-гадовая дзяўчынка, нягледзячы на вялікае жаданне закончыць школу, ідзе працаваць. Спачатку дыктарам і машыністкай у мясцовай рэдакцыі радыёвяшчання, потым сакратаром у газеце.

Аднойчы, выконваючы рэдакцыйнае заданне, дапазна затрымалася ў пасёлку Горны. Была восень, ішоў дождж. Дзяўчыне прапаноўвалі застацца. Але Тоня не паслухалася, пайшла. Ішла ночку, праз лес, перамагаючы страх.

Тоня ведала, — яе там чакаюць. Не хто іншы, а яна ў 4 гадзіны раніцы павінна прыняць і запісаць матэрыял аб звестках з фронту, а потым змясціць яго ў газеце. Не з'явіцца — значыць падвесці рэдактара... Такой на ўсё жыццё і засталася Антаніна Фёдараўна. І тады, калі працавала машыністкай, і зараз, калі яна з'яўляецца загадчыцай кабінета гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

Як толькі паявілася магчымасць, закончыла вячэрнюю школу, потым гістарычнае аддзяленне завочнага факультэта

Заўсёды, не шкадуючы сіл і часу, яна з душой выконвала любое даручэнне. А іх за час работы ва універсітэце было шмат. У 1951—1953 гадах — сакратар камсамольскага бюро, тры гады — адказны сакратар арганізацыі таварыства «Веды» (на грамадскіх пачатках), член партбюро хімічнага факультэта, член вучэбна-выхаваўчай камісіі пры парткоме універсітэта, член праўлення раённай і гарадской арганізацыі таварыства «Веды»...

І сапраўды, шмат зроблена гэтай жанчынай. З яе дапамогай арганізуюцца шматлікія сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, праводзяцца экскурсіі па Мінску, месцах баявой славы, чытаюцца тэматычныя лекцыі...

Той, хто заходзіў у чытальную залу хімічнага факультэта, напэўна, заўважыў новую выстаўку кніг, прысвечаную 60-годдзю ўтварэння СССР. Тут таксама не абышлося без дапамогі Антаніны Фёдараўны.

Яна ніколі не скажа: «Мая хата з краю». Шмат цяжкасцей і перажыванняў выпала на долю гэтай жанчыны. Але так здарылася, што ўвесь час побач былі людзі, якія ёй дапамагалі. Можа таму Антаніна Фёдараўна любіць іх, а яны, адчуваючы дабрату, хінуцца да яе, раяцца.

**Н. ЖУКАВА.**



Людміла Рабушка — адна з лепшых студэнтак фізічнага факультэта. Усе сесіі яна здае паспяхова. А з апошняй, сёмай, у яе залікоўцы толькі «выдатна». Люда — камсамольскі важак сваёй групы.

Фота В. ШАЧАКА.

# ЧАЛАВЕК ВЯЛІКАГА СЭРЦА

У ДРУКАРНЮ БДУ Н. Ф. Алькіна прыйшла 18-гадовай дзяўчынай адразу ж пасля вайны. Ды так і засталася тут. Авалодала прафесіяй наборшчыцы. Прывыкла, уцягнулася ў работу. Але галоўнае, што надоўга, на ўсё жыццё затрымала яе ў гэтай друкарні, — гэта маленькі, але на дзіва зладжаны калектыў. Цяпер ужо і сказаць цяжка, якім чынам і дзякуючы каму стварыўся тут ён. Але Ніна Фёдараўна не пажадала развітацца з супрацоўнікамі, нават калі надышоў пенсійны ўзрост. Задоўга да гэтага часу вырашыла: калі прапануюць застацца — застануся. А не прапанаваць ёй, старэйшаму майстру, не маглі...

З вялікай павагай, цеплынёй і ўдзячнасцю гавораць пра яе рабочыя: і тыя, хто ведае Алькіну шмат гадоў, і маладыя дзяўчаты, што прыйшлі ў друкарню зусім нядаўна. І кожны, з кім бы я ні гаварыла, як першую і галоўную рысу Ніны Фёдараўны адзначае яе чуласць. І радасць, і горыч, і боль, і шчасце кожнага яна ўспрымае, як сваё. Калі трэба суцешыць — дапамажа неадкладна і тактоўна, каб дапамагаю сваёй не зрабіць балюча. Яна не ўмее рабіць балюча. Недзе глыбока ў сэрцы гэтай жанчыны гарыць маленькі агеньчык, які ўвесь час дасылае людзям праменьчыкі цяпла і святла свайго. І людзям побач з Нінай Фёдараўнай заўсёды добра. «Бо калі разумее цябе нехта і разумее так, як хацелася б, забываешся на ўсе нягшчасці свае і крыўды, і праца, якая б цяжкая ні была, лягчэйшай робіцца», — сказала мне Яніна Фёдараўна Вашкевіч, адна з першых вучаніц Алькінай.

Цяжка ўявіць друкарню без Ніны Фёдараўны. Трыццаць сем гадоў жыцця свайго аддала ёй Алькіна. Тут і ў партыю ўступіла. І амаль 50 вучаніц падрыхтавала. Тут пакінула шмат дабраты і пяшчоты свайго вялікага сэрца.

Верным сябрам, вопытным майстрам, сапраўдным чалавекам называюць яе людзі.

**Л. МАЛАШЭНЯ.**

# ШЧЫРЫ ТАВАРЫШ

УВОГУЛЕ наша мысленне выпрацоўвае стэрэатыпны вобраз выдатніцы. Увесь час — вучоба. Убок усё тое, што перашкаджае канспектаваць, сядзець у бібліятэках да самага іх закрыцця. А потым яшчэ дома ўсё паўтарыць, замацаваць. І так кожны дзень.

На жаль, сярод выдатнікаў сустракаюцца і такія.

Але нядаўна мне пашанцавала сустрэць дзяўчыну, якая арганічна аб'ядноўвае ў сваім працоўным дні вучобу і адпачынак.

Святлана Амяльянец кожную сесію здае на «пяць», выконвае абавязкі старшыні савета выдатнікаў, курыруе акадэмічны сектар групы і паспявае не толькі ў чыталку, але і ў кіно ці тэатр, прачытаць цікавую кнігу ды ўрэшце проста пагуляць.

Гэта ўжо восьмая яе вясна ў Мінску. Прыехала яна з Брэсцкай вобласці пасля васьмігодкі.

Пасля заканчэння тэхнікума — праца ў вылічальным цэнтры Міністэрства прамысловага будаўніцтва. Шэсць месяцаў працавала і ўвесь гэты час марыла аб тым, каб працягваць вучобу. Думала паступаць ва універсітэт і рыхтавалася.

Трэба заўважыць, што Святлана закончыла тэхнікум з чырвоным дыпломам, і пры паступленні ў БДУ (дакументы падала на ФПМ) яна павінна была здаваць адзін экзамен — матэматыку.

Іменна ў гэты час Света адкрыла для сябе новы свет — паэзію. Больш за ўсё прыцягвала чысціня і зачараванасць вершаў Лермантава. Можа і яны трохі дапамаглі ёй у пераадоленні цяжкасцей.

Калі ўжо ўступны экзамен быў ззаду і «пяцёрка» расчыніла дзверы ва універсітэт, прыйшло задавальненне і радасць.

У дзканаце я спытаў пра Святлану Амяльянец. З адказу зразумеў: стаяцца да яе з павагай і ведаюць як добрасумленную студэнтку, якая атрымлівае стыпендыю імя К. Маркса, шчырага і ветлівага таварыша.

**С. ТРУСЕВІЧ.**



Камсорг групы другога курса біяфака Вольга Запольская.

# СЯБАР І ДАРАДЧЫК

НЕ ВЕДАЮ, як гэта назваць: традыцыя ці нешта іншае. Але так ужо атрымліваецца, што калі ў аўдыторыю заходзіць новы выкладчык, мы, студэнты, амаль усё ведаем пра яго: як ён чытае лекцыі, вядзе семінарскія, прымае экзамены. Вядома, адкуль — старэйшы курс, як эстафету, перадаў.

Аб Людміле Андрэеўне Паўловіч, дацэнце кафедры эканамічнай геаграфіі СССР, гавораць прыкладна так: патрабуе глыбокіх, трывалых ведаў. У яе і двойку лёгка схапіць, і на лекцыі трэба абавязкова хадзіць (а то адпрацоўваць прыйдзецца). Але праз некалькі заняткаў студэнты разумеюць: патрабаванні ў Людмілы Андрэеўны звычайныя, якія і патрэбны. Выкладчыца імкнецца даваць матэрыял як мага шырэй, цікавей. Дэвіз яе вызначыць няцяжка: як выкладаю, так і патрабую.

Атмасфера на яе лекцыях творчая. Напрыклад, ездзілі студэнты-географы ў Сібір. Гэты факт Людміла Андрэеўна выкарыстала ў час адпаведнай лекцыі. Студэнты падрыхтавалі выступленні, расказалі аб новабудоўлях Сібіры, прынеслі слайды. Актыўным быў кожны ў аўдыторыі...

Якія гады ў педагагічнай рабоце яна можа назваць гадамі найбольш памятнымі ў жыцці? Напэўна, 1973—1978 гг. Людміла Андрэеўна тады была куратарам адной з груп геафака. Пяць гадоў пройдзена нага ў нагу са студэнтамі. Не ўсе калегі разумелі, чаму Паўловіч з раніцы да вечара на факультэце: рыхтуе вечары, «агеньчыкі», праводзіць шматлікія сустрэчы з цікавымі людзьмі. Такі ўжо чалавек Людміла Андрэеўна. Калі бярэцца за справу, дык аддае ёй усю душу.

Вядома, калі збіраліся ўсёй групай ісці ў паход, тэатр ці кіно, ніхто не думаў аб тым, як заняць у сацыялістычным спаборніцтве паміж студэнцкімі групамі універсітэта першае месца. Гэта перамога была для студэнтаў разам з Людмілай Андрэеўнай поўнай нечаканасцю. Потым і ўзнагарода за поспех — паездка ў Ясную Паляну і Прыбалтыку. І для кожнага яна была не толькі куратарам, але і надзейным старэйшым сябрам.

У групе былі людзі розных узростаў — ад 17 да 23 гадоў, меліся непазбежныя «двойкі» і «тройкі», сутыкаліся процілеглыя погляды і густы. Стварыць мікраклімат узаемаразумення — задача цяжкая. Зараз Людміла Андрэеўна ганарыцца сваімі вучнямі. У кожнага з іх даўно ўжо самастойная сцежка ў жыцці, але яны часта пішуць свайму былому куратару, каб па студэнцкай звычцы падзяліцца радасцю, расказаць аб сабе, параіцца.

Якой мэтай кіруецца Паўловіч-выкладчык у сваёй штодзённай рабоце? Па-першае, навучыць свайму прадмету так, каб не было ў студэнтаў прабелаў у ведах. Многім на геафаку вядома, што на практычці студэнты вядуць урокі па канспектах яе лекцый. Падругое, пакінуць след у душы чалавека, падзяліцца з ім сваімі думкамі, назіраннямі.

Людміла Андрэеўна лічыць, што геаграфію сваёй Радзімы павінен ведаць кожны культурны чалавек. І студэнты яе таксама ў гэтым упэўнены.

**Р. МАРЧУК.**




# НАШЫМ СЯБРОЎКАМ!

**У РЭДАКЦЫЮ ПРЫЙШОЎ ДОПІС (СВОЕАСАБЛІВЫ МАНАЛОГ) МУЖЧЫН З НАГОДЫ 8 САКАВІКА.**

НАШЫ СЯБРОЎКІ! У чым радасць ад сустрэч з вамі? Чаму вы такія? Гэтыя вочы, гэтыя вусны і валасы, якія пахнуць надаждом. Гэты носік і канспекты па ўсіх прадметах.

Таварышы студэнткі! Назад! Хопіць! У бібліятэках дзяўчаты, у студсавеце дзяўчаты. Дзе ж хаваюцца гэтыя хлопцы? Нават у інтэрнаце адны бабулькі на вахце.

А вось яны — моцная палавіна чалавецтва — мяшкі пад вачыма к трэцяму курсу, жываты — на пятым. Хто можа быць такім задаволены?

Яны і стыпендыю ўсе атрымліваюць, нашы дзяўчаты, з гэтым мы ўжо звыкліся. Яны і выглядаюць лепш за нас — мы таксама ўжо пагадзіліся. Яны апранаюцца прыгажэй. Зараз мы спрабуем што-небудзь ужыць—модныя джынсы, гальштук на шыю (толькі калі ваенка). Але ж з мяшкамі пад вачыма і гальштукам на шыі далёка не паедзеш.

Нашы мілыя замужнія студэнткі, наша ўпрыгожанне. Уставаць рана, гатаваць снеданне, збіраць дзіця і гэтага тыпа на заняткі! Самой на хаду праглынуць маленькі кавалачак, паспець прычасацца. Прыйсці на лекцыі і ўсё канспектаваць. Потым прыбегчы дамоў, накарміць сына і гэтага тыпа. І бегаць, і прыбіраць, і шыць... А раніцай будзільнік толькі для цябе. Для цябе будзільнік, як для цябе агонь пліты, натоўп і таўкатня. А ты паправіш валасы і бягом. І кахаюць цябе якраз не за гэта: да гэтага прывыклі. Кахаюць за другое — за вейкі твае, за вусны, і за слабасць, і за пяшчоту тваю. Паспрабуй заставацца слабай, прабягаючы пяцьдзесят кіламетраў. А ты ўмудраешся. І я цябе кахаю за ўсё. Толькі прашу, прыпыніся на бягу, стань стройна, паглядзі ў люстэрка, папраў прычоску. І зноў уперад...

А мы чакаем цябе. Чакаем усюды. З кветкамі і без. Са словамі і моўчкі. На вуглу і дома. Прыходзь! І ў дождж і ў снег... І абавязкова на 8 Сакавіка...

# ХАРАКТАРЫСТЫКА

— ПАКАЖЫЦЕ, калі ласка, ваш пашпарт і ваенны білет,— сказаў ён.

— Я паказаў.

— І даведку з ЖЭКа.

Я прынёс даведку.

— І характарыстыку з апошняга месца работы.

— Калі ласка.

— Маральна ўстойлівы,— прачытаў ён і недаверліва паглядзеў на мяне,— вядзе вялікую грамадскую работу, з'яўляецца донарам... Ну, што ж, Леначка, ён мне таксама падабаецца. Я не супраць вашага шлюбу.

«Ну і бацька, — сцепануўся я. — Як добра, што яна на яго зусім не падобна».

Пажаніліся мы.

І хутка высветлілася, які ў яе характар.

І чаму толькі я ў свой час характарыстыку ў яе не папрасіў?




# ВЕТЛІВАСЦЬ

ШМАКАЎ заўсёды лічыў сябе ветлівым.

Ён самааддана будзе стаяць у аўтобусе, нават калі ёсць шмат свабодных месц. І лепш адарве сваё вуха ў роспачы ад несправядлівасці суддзі, чым дазволіць сабе свіснуць на стадыёне. А кашлянуць у кіно?! У час сеанса?! Ды няхай ён задыхнецца, але гэтаму не бываць...

І трэба такому здарыцца — Шмакаў закахаўся.

Таню, у якой былі цёмна-сінія, пяшчотныя вочы, ён убачыў на танцпляцоўцы. Ветлівасць не дазваляла Шмакаву проста так падыйсці да яе і спытаць імя, але ён цвёрда вырашыў у першы зручны момант запрасіць дзяўчыну на танец і тады...

Грымела музыка. Таню заўважыў адразу. Усё, здаецца, як мае быць, але крыху замінала суседка Светка, якая круцілася побач і ўсё пра нешта балбатала.

«Перарваць яе — нявetліва. З другога боку, яшчэ хто падумае, што яна мая дама,— засумняваўся Шмакаў.— Не. Трэба пачакаць, пакуль адыйдзе».

Але дзяўчына, як назло, не адыходзіла...

Прайшло хвілін сорак. За пятнаццацігадовай суседкай з'явілася маці, і Шмакаў з палёгкай адчуў сябе свабодным.

«Цяпер ці ніколі!» — вырашыў ён, калі аб'явілі апошні танец, і рушыў да лаўкі, дзе сядзелі дзяўчаты. Таня заўважыла яго, і сінія вочы яе яшчэ больш засінелі ад шчасця.

— Дазвольце вас... — ледзь вымавіў Шмакаў.

— Вы мяне? — ускочыла са свайго месца пышная бландзінка.

«Што ж гэта робіцца... — разгубіўся хлопец, — але нельга адмовіць». І павёў сваю незапланаваную партнёршу ў цэнтр залы. Апошняе, што ён заўважыў, — сінія слёзы ў вачах Тані.

«Нічога, пасля танцаў я яе ўжо не ўпушчу...»

— Хто з кім танцуе, той таго і праводзіць дадому,— зароў мікрафон.

Нафарбаваная бландзінка моцна прыціснулася да Шмакава. А Шмакаў заўсёды лічыў сябе ветлівым.

...Дадому Таня ішла з Воўкам Петрыкавым з суседняга пад'езда...

# ДЫЯЛОГ

ЗВЯРТАЮЦЦА да паэта, які скончыў факультэт журналістыкі:

— Скажыце, з чаго вы пачалі свой шлях у літаратуру?

— Са скандалу. Нідзе не хацелі браць мае вершы.

— І чым гэты скандал закончыўся?

— А ён яшчэ не скончыўся.




Без слоў.

# НОВАЕ ПРА ШЭФАЎ

КОЖНЫ студэнт хімічнага факультэта за адзін экзамен губляе да трох кілаграмаў! Да такога вываду прыйшлі піянеры падшэфнай школы № 8, якія вось ужо некалькі гадоў запар утрымліваюць вымпел лепшых зборшчыкаў макулатуры.




Матэрыялы для сакавіцкага выпуску Лірычна-Іранічнага ФакультэТа (ЛІФТ) падрыхтаваў У. Дашук. На яго ж сумленні і адказнасць за знойдзеныя малюнкі.



*ПРЫЙШОЎ САКАВІК. Снег яшчэ ляжыць гурбамі, але ён стаў шэрым і шчыльным, цяжкім ад вады. Пачарнелі ўкатаныя дарогі, па канаўках пабеглі першыя ручайкі. Яны яшчэ не журчаць па-вясноваму гучна, а па начах марозу ўдаецца спыніць іх бег, але ўсё роўна ўсюды адчуваецца вясна.*

*Весялей запелі сініцы, заўзята зачырыкалі вераб'і, вылез на прызбу пагрэцца шэры кот. Ясныя дні напоўніліся ззяннем неба, празрыстымі сталі сасулькі і звонкім капеж. Можа, зіма яшчэ рыхтуе сюрпрызы перад сваім уходам?*

*«Но не удержишь птицу,*
*Коли весна на юге,*
*К дому она стремится,*
*Хоть и остались вьюги».*

*Усё абуджаецца ў прыродзе. Хутка запыляць арэшнік і алешына. Ужо непрыкметна для нас у пупышках абуджаецца жыццё: дрэвы рыхтуюцца апрануць новы ўбор. Зусім хутка, у красавіку, «заплачуць» бярозы.*

*«Песенка снега спета.*
*Песня весны поется!»*

**А. ВАЛОШЫН.**

Фотаэцюд **В. Шачака.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

4 сакавіка 1982 г.

АТ 21163. Зак. 481.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ